ў прамым эфіры, і, як мы ўжо высветлілі, адной з самых галоўных задач журналіста сёння з'яўляецца правесці праграму ў рэжыме life, каб наблізіцца да слухача і сцерці граніцу, якая ствараецца паміж журналістам і аўдыторыяй, то гэтыя элементы апраўдваюцца гэтай задачай.

Аб укараненні сучасных тэхнічных сродкаў сведчаць эпізоды перадачы, у якіх гукарэжысёр Іна Цецянок уключала ў эфір запісы радыёспектакляў, створаных Валерыем Бяляевым. А таксама ўключэнне адбівак падчас трансляцыі праграмы.

Аналіз радыёпраграмы, які мы правялі, дазваляе зрабіць выснову аб тым, што метад работы ў прамым эфіры радыёвяшчання мае свае складанасці і нюансы. Таму журналіст, які выходзіць у прамы эфір, павінен быць гатовы да любых форсмажораў, пачынаючы ад перапынення вяшчання да непаразуменняў з гасцямі праграмы. Прамы эфір дае журналісту магчымасць пагрузіць слухача ў атмасферу тых падзей, пра якія распавядаюць у эфіры, гэта забяспечвае эфект прысутнасці.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. Кузнецов, Г. В. Телевизионная журналистика: Учебник. 3-е издание, переработанное и дополненное / Г. В. Кузнецов // Редколлегия: Г. В. Кузнецов, В. Л. Цвик. А. Я. Юровский. – Москва: Издательство МГУ, Высшая школа, 2002. – С. 304.

## КАНАЛ «КУЛЬТУРА» Ў ФАРМІРАВАННІ НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ

**В. М. Самусевіч**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

Феномен нацыянальна-культурнай прасторы Рэспублікі Беларусь, у адрозненне ад паняцця культурная прастора, пакуль не так глыбока вывучаны, таму мы ў дэфініраванні гэтага тэрміна будзем зыходзіць з пазіцыі непадзельнасці і ўзаемаабумоўленасці паняццяў нацыянальнай культуры і культурнай прасторы Беларусі. Гэту думку падтрымлівае і прафесар А. Г. Слука, адзначаючы, што «су-

часная культурная прастора і нацыянальная культура знаходзяцца ў дыялектычным адзінстве і ў пастаянным працэсе ўзаемнага ўзбагачэння і развіцця. У культурнай прасторы здзяйсняецца дынамічнае самаразвіццё чалавека, і ад гэтага непасрэдна залежыць рашэнне тактычных праблем грамадства і дзяржавы» [3].

Адну з такіх праблем вынікавала глабалізацыя інфармацыйнай прасторы, стварыўшы небяспечныя для нацыянальнай культуры ўмовы для ўзнікнення міжкультурных і, адпаведна, міжнацыянальных супярэчнасцяў і канфліктаў. Апошнія звязаны з навязваннем, а часам з агрэсіўнай прапагандай іншых культурных каштоўнасцяў, адпаведна чужой культуры, а часам і гвалтоўнай асіміляцыі сваёй. У гэтым рэчышчы захаванне і развіццё нацыянальнай культурнай прасторы ўзаемазвязана з захаваннем цэласнасці краіны і супрацьдзеяннем дэкструктыўным працэсам, якія назіраюцца апошнім часам – спробай змены/замены/нівеліравання традыцыйных каштоўнасцяў беларусаў, іх фальсіфікацыяй, а часам і прысваеннем.

Відавочна, што сёння культурнае ўзаемадзеянне набывае глабальныя маштабы і выразную геапалітычную скіраванасць, а таму патрабуе новага разумення, новага асвятлення і кантэксту. Падымаецца праблема захавання бяспекі прасторы беларускай культуры і духоўнага развіцця нацыі, адной з найважнейшых умоў якой з’яўляецца бяспека нацыянальнай інфармацыйнай прасторы.

Пытанні забеспячэння бяспекі нацыянальнай культурнай прасторы сёння не толькі вастраактуальныя, але і ўскладненыя шэрагам фактараў сацыяльна-палітычнага характару. Гістарычна склалася, што ў СМІ паняцце культура абавязкова ўтрымлівае ідэалагічны сэнс, паколькі трансляцыя, асэнсаванне і пераасэнсаванне каштоўнасцяў нацыянальнай культуры прыводзіць да кардынальнай перабудовы мадэлі свету, у прыватнасці сацыякультурнай карціны свету.

2020-я гг. – час звароту да традыцыйных культурных каштоўнасцяў, якія зараз не столькі патрабуюць пераасэнсавання, колькі захавання і змястоўна-канцэптуальнай актуалізацыі ў сучасных ўмовах. Культура сёння стала важным сацыяльным феноменам, які сумяшчае ўсе характарыстыкі ментальнасці пэўнага грамадства і яго духоўна-практычнай дзейнасці. Вучоныя бачаць менавіта ў культуры тыя сілы, якія фарміруюць мысленне. Так, Э. Сепір пісаў аб тым, што культуру можна вызначыць як тое, што пэўнае грамадства робі-

ць і думае. На базе маральных імператываў новага часу і функцыянуючай ў грамадстве сацыяльна-гістарычнай сістэмы культурных каштоўнасцяў у нацыянальнай асобы фарміруецца спецыфічная сукупнасць прыкмет разумення рэчаіснасці і свайго месца ў ёй. Асобасныя веды фарміруюцца ў тым сацыякультурным і этнічным кантэксце, у якім развіваецца асоба. Менавіта культурны ўзровень чалавека ў сваіх розных праяўленнях вызначае і сацыяльную ідэнтыфікацыю. Таму сёння гэта як ніколі раней важна.

У гэтых ўмовах узрастае роля журналістыкі, адной з асноўных функцый якой з'яўляецца культурафарміруючая. У нацыянальнай інфармацыйнай прасторы ключавую ролю адыгрывае канал Беларускага радыё «Культура».

Канал «Культура» стаў першай у Беларусі спецыялізаванай беларускамоўнай радыёстанцыяй, арыентаванай на інтэлектуальных людзей, якія цікавяцца нацыянальнымі і сусветнымі культурнымі дасягненнямі і адметнымі падзеямі ў свеце мастацтва. Сваю місію канал вызначае як «ідэнтыфікацыя нацыянальнай культуры ў кантэксце сусветнай». Звернемся падрабязней да функцый, што выконвае канал «Культура» з мэтай фарміравання, развіцця і захавання нацыянальна-культурнай прасторы з яе адметнасцямі і дасягненнямі.

***Гуманістычная*** функцыя канала непарыўна звязана з ***культурафарміруючай*** і скіравана на фарміраванне ў слухачоў гуманістычнага светаўспрымання. Так, агульнавядома, што галоўнае прызначэнне культуры – быць сродкам духоўнага ўзбагачэння асобы. У сувязі з гэтым вялікае значэнне набывае працэс інкультурацыі пры дапамозе журналістыкі, якая абавязана забяспечваць культурнай інфармацыяй грамадства, культывіраваць неабходныя для існавання і духоўнага развіцця нацыі каштоўнасці, фарміруючы ў беларускага соцыуму пэўныя культурныя арыенціры і мадэлюючы сучасную нацыянальную карціну свету, захоўваючы тым самым багацце нацыянальнай культуры. Сапраўдныя адрозненні культуры нацыі ў асаблівым, толькі ёй уласцівым наборы агульначалавечых рысаў, у непаўторнасці іх злучэння і ў самабытнай іх рэалізацыі. Валодаючы культурнай кампетэнцыяй, змацнеўшы ў нацыянальнай культуры і духоўнасці, чалавек дастаткова падрыхтаваны да азнаямлення з іншай культурай. Тады і вынікам інтэрферэнцыі культур

стане ўзбагачэннё сваёй, нацыянальнай, культуры лепшымі традыцыямі сусветнай, і наадварот. Усё гэта робіць канал «Культура» разам са сваімі партнёрамі (Белдзяржфілармонія, Вялікі тэатр Беларусі і інш.). Напрыклад, запіс канцэртаў, якія яны арганізоўваюць, перадаецца ў сусветны канцэртны фонд, арганізаваны Еўрапеўскім вяшчальным саюзам, што дазваляе папулярызаваць нацыянальныя музычныя здабыткі шырокай аўдыторыі больш з 73 краін свету.

Адметным з'яўляецца і праект «Планета "Культура"», што ўяўляе своеасаблівую аўдыяльную вандроўку, пад час якой слухачы даведваюцца пра мастацтва, традыцыі і сучаснае жыццё розных народаў свету, пра культурныя падзеі, што адбываюцца ў розных краінах свету, пра вернісажы і канцэрты замежных майстроў мастацтва ў Беларусі, а таксама пра жыццё беларускай дыяспары далёка ад радзімы.

Місію канала дазваляе рэалізаваць і штотыднёвы пазнавальны праект «Кругасвет» з удзелам прадстаўнікоў розных краін, якія прыязджаюць у Беларусь. Праект накіраваны на знаёмства з духоўнай спадчынай замежных краін, на выяўленні агульных і адметных з беларускай культурай рыс.

Наступная функцыя канала «Культура» – *адаптыўная*, якая прадстаўлена трыма ўзаемазалежнымі задачамі: *адаптацыі, сацыялізацыі і гарманізацыі*. Адаптыўная функцыя арыентавана на дапамогу ў засваенні сістэмы ведаў, норм, каштоўнасцяў, прывучэнне да сацыяльных роляў, нарматыўных паводзін, падтрымку імкнення да самаўдасканалення. Напрыклад, створаны публіцыстычны праект аб эмацыянальным інтэлекце людзей «Алгарытм гармоніі» з удзелам псіхолагаў, псіхатэрапеўтаў, арт-тэрапеўтаў, нейрапсіхолагаў. Праграма прадугледжвае абмеркаванне актуальных тэм, звязаных з чалавечай псіхікай, эмоцыямі і паводзінамі ў розных сітуацыях. Шэраг праектаў для дзяцей і падлеткаў таксама дазваляе рэалізаваць гэтую функцыю.

*Пазнавальная* функцыя ўключае *гнасеалагічны, камунікатыўны* і *трансляцыйны* накірункі дзейнасці.

*Гнасеалагічная* (пазнавальная) функцыя арыентавана на канцэнтрацыю і асэнсаванне вопыту папярэдніх пакаленняў, каб праз гэту прызму даць цэласнае уяўленне беларусам пра іх саміх. Напрыклад, рэалізуецца пазнавальны мастацтвазнаўчы праект «Лекторый», які

распавядае пра асаблівасці развіцця мастацтва XX–XXI стст., разнастайныя напрамкі, стылі і жанры, яркіх прадстаўнікоў сусветнай мастацкай культуры, ролю беларускіх творцаў ў гэтых працэсах. Праграма «Радыётэатр плюс» знаёміць з адметнымі ўзорамі радыёдраматургіі і радыёверсіямі спектакляў, увасобленымі ў розныя гады, а праект «На паліцах фанатэкі» – з унікальнымі дакументальнымі і мастацкімі фондамі Беларускага радыё.

Літаратурна-мастацкі праект «Прачулым радком» прадстаўляе найперш падборкі паэтычных твораў класікаў айчыннай літаратуры. Так, з пачатку новага вяшчальнага сезона на хвалях «Культуры» ўжо прагучалі вершы Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Максіма Танка, Уладзіміра Дубоўкі, слухачы пазнаёмяцца з паэтычнымі радкамі Петруся Броўкі, Сяргея Грахоўскага, Аркадзя Куляшова, Язэпа Пушчы і іншых творцаў.

Шэраг твораў знайшлі аўдыяльную рэалізацыю на канале. Спецыялізаваная радыёхваля папулярызуе лепшыя мастацкія творы краіны і свету. Напрыклад, кніга Яна Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях». Ці ў рамках праекта «Літаратурная анталогія» канал праводзіць літаратурныя чытанні старонак з рамана «Людзі на балоце» ў выкананні артысткі Лікі Пташук.

*Камунікатыўная* функцыя дазваляе людзям узаемадзейнічаць, камуніцыраваць паміж сабой. І, адзначым, што камунікацыі канала ўласцівы дыялагічны характар, які садзейнічае стварэнню гарманічнай абстаноўкі зносін гасцей і вядучых і арыентуе на актыўны удзел слухачоў. Пазітыўная камунікацыя, што наладжана каналам «Культура», дазваляе дасягнуць высокага ўзроўню ўзаемаразумення ўсіх удзельнікаў камунікацыі. Напрыклад, прафарыентацыйная рубрыка «Знаёмства з БДУ».

Функцыю *трансляцыі*, перадачы пэўнага вопыту ад пакалення пакаленню, вызначаюць часам як функцыю гістарычнай пераемнасці. Тут адразу ўзгадваецца праект «Гасцінец», які ўяўляе пазнавальныя фальклорныя вандроўкі па Беларусі: песні, танцы, аўтарскія творы з выкарыстаннем фальклору, гутарка з запрошаным госцем-выканаўцам ці кіраўніком музычнага калектыву, знаёмства з музыкай, якая суправаджала традыцыйныя беларускія абрады. Ці праект «Беларуская этнафонія», які цалкам прысвечаны народнай

музычнай культуры. Аўтар перадачы і яго госці – этнамузыколагі, фалькларысты, лідары фальклорных калектываў і аматары народнай музыкі – знаёмяць слухачоў з этнамузычнай традыцыяй беларусаў ва ўсім шматабліччы яе праяў, з носьбітамі аўтэнтычнай спадчыны і мастацкімі ўзорамі.

Як мы бачым, апошнія дзве функцыі – камунікатыўная і трансляцыі – цесна ўзаемазвязаны, паколькі арыентаваны на захаванне, тыражыраванне і перадачу культурных каштоўнасцяў.

Напрыклад, праграма «Рэтра-хіт» запрашае ўзгадаць любімыя песні мінулых гадоў і складацца выключна па заяўках слухачоў. Выконваюцца вядомыя, паўзабытыя і малавядомыя песні айчыннай і замежнай эстрады, танцавальныя рэтра-рытмы ў выкананні папулярных калектываў XX стагоддзя. Аўтары праекта вызначаюць яго як «своеасаблівую вандроўку ў свет музыкі мінулых гадоў».

*Інтэгратыўная* функцыя прадугледжвае, што канал забяспечвае ўзаемадзенне паміж рознымі групамі і сегментамі грамадства, чым іх аб'ядноўвае, ствараючы адзіную інфармацыйную прастору і фарміруючы грамадскую думку як кансалідаваную, узгодненую пазіцыю. Так, адна з першых праграм на канале «Культура» – «Дыялогі пра культуру». За гады існавання яна стала віртуальнай пляцоўкай для абмеркавання самых значных падзей у сферы мастацтва, літаратуры, кіно, тэатра. Вядучымі праграмы былі мастацтвазнаўцы, культуролагі, журналісты. У эфіры канала «Культура» таксама можна паслухаць аўдыяверсію праграмы «Суразмоўцы» Навума Гальпяровіча, якая выходзіць на тэлеканале «Беларусь – 3».

Трэба адзначыць шматфункцыянальнасць – характэрная адметнасць радыёканала: канцэптуальная скіраванасць той ці іншай праграмы/праекта, як правіла, выразна вызначае вядучую функцыю, пры гэтым заўважны і выконваюцца і іншыя. Напрыклад, пры правядзенні тэматычных вечароў з цыкла «Радыё на хвалі мастацтва» ў Дзяржаўным музеі Янкі Купалы, прысвечаных прафесійнай і культурна-асветніцкай дзейнасці радыё ў розныя часы. Таксама канал праводзіць і шмат конкурсаў. Напрыклад, інтэрактыўны конкурс «Быў. Ёсць. Буду», прысвечаны дню нараджэння Уладзіміра Караткевіча і 95-годдзю Беларускага радыё.

*Кампенсаторная* (рэкрэатыўная) і *гульнявая* функцыі арыентаваны на зняцце напружання, на адпачынак і псіхалагічную разрадку

пасля паўсядзённай дзейнасці, садзейнічаюць праяўленню непасрэднай чалавечай прыроды. Напрыклад, праект «Вячэрняя казка» – штодзённая праграма для маленькіх слухачоў, падчас якой выкарыстоўваюцца народныя і аўтарскія казкі, а таксама творы з фондаў.

Варта адзначыць, што ў сусветнай прасторы сёння актыўна тыражуецца інфармацыя высокай мадальнасці, аднак з нулявым культурным патэнцыялам, што зводзіцца, як правіла і ў лепшым выпадку, да суб'ектыўнай ацэнкі культурнай падзеі. Гэта звязана найперш з тым, што «парадыгма развіцця культуры змянілася радыкальна: ад асветніцкай да забаўляльнай» [1, с. 170]. Усё ж, нягледзячы на тое, што сусветная журналістыка мае маскультавы характар, нельга забываць старыя традыцыі айчыннай журналістыкі. Адной з якіх, на думку Л. Саянковай-Мяльніцкай, была традыцыя, звязаная з культурай інфармацыі, культурай дыялогу з чытачом, культурай мыслення [2, с. 225]. І канал «Культура» ў гэтым плане, на нашу думку, узорны.

Канал шмат увагі надзяляе пытанням выхавання дзяцей і падлеткаў, выконваючы важную ***выхаваўчую*** функцыю. Напрыклад, мастацкі праект «Дзіцячы радыётэатр», накіраваны на выхаванне маладога пакалення на лепшых узорах сусветнай літаратуры, увасобленых у запісах з фондаў Беларускага радыё.

Да гэтага часу «выхаваннем» дзяцей на канале «Культура» займалася «Мэры Попінс». Сучаснаму пакаленню радыёканалам прапанаваны новы фармат – праграма «ДНК» – «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя». Канал вызначае задачу гэтага праекта: «ДНК – гэта тое, што робіць кожнага з нас унікальным. Адначасова ДНК – гэта тое, што адлюстроўвае нашу ідэнтычнасць. Усе мы носьбіты беларускага ДНК». Змест рубрык ахоплівае ўсе бакі жыцця: прафарыентацыя, камунікацыя, шчырыя размовы з дактарамі і псіхолагамі і знаёмства з таленавітымі юнымі беларусамі. Гэта аўдыяльная пляцоўка становіцца рэальным дыскусійным клубам, які дазваляе самавыражацца юным слухачам і адкрыта выказваць падлеткам сваю думку і меркаванне. Аднак і самым маленькім праект будзе цікавы: ім прапаноўваюцца, напрыклад, аповеды пра жывёльны і раслінны свет.

Сучаснае грамадства скіроўваецца на новую сістэму культурных каштоўнасцяў, вынікаваных новым мысленнем, новымі рэаліямі. Аднак у пагоні за новым варта не згубіць тое, на чым базуецца наша

нацыяльна-культурная прастора. Новыя каштоўнасці, якія шырока прапагандуюцца ў свеце, не заўсёды з’яўляюцца каштоўнасцямі для нашай культуры. І таму радыёканал «Культура» дапамагае аддзяліць «зёрна от плевел». Сучаснай аўдыторыі неабходна аб’ектыўная інтэрпрэтацыя фактаў і з’яў, прафесійны аналіз і кампетэнтныя сцвярджэнні і ацэнкі, дакладная інфармацыя пра розныя аспекты і падзеі культурнага жыцця краіны. І дзеля таго, каб не разбурыць асновы нацыянальнай культуры, зберагчы культурныя традыцыі і каштоўнасці беларускага народа, захаваць духоўнасць нацыі, развіваць адметную ў свеце нацыянальна-культурную прастору канал «Культура» на роднай беларускай мове праз выхаванне культуры і ў культуры фарміруе ў кожнага свайго слухача пачуццё адказнасці за тое, якую культуру ён пасля перадасць сваім дзецям, што ён навучыць іх любіць і якімі каштоўнасцямі кіравацца ў жыцці.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Медведева, О. А. Медиакультура: между раритетом и архетипом / О. А. Медведева // Жыццём і словам прысягаючы…: да 85-годдзя заслуж. работніка адукацыі Рэсп. Беларусь, д-ра філал. навук, праф. Міхася Яўгенавіча Цікоцкага: зб. навук. прац. / пад агул. рэд. д-ра філал. навук, праф. В.І. Іўчанкава. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2007. – С. 170.
2. Саенкова, Л. П. О культуре публикаций по вопросам искусства / Л. П. Саенкова // Жыццём і словам прысягаючы…: да 85-годдзя заслуж. работніка адукацыі Рэсп. Беларусь, д-ра філал. навук, праф. Міхася Яўгенавіча Цікоцкага: зб. навук. прац / пад агул. рэд. д-ра філал. навук, праф. В.І. Іўчанкава. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2007. – С. 219–226.
3. Слука, О. Г. Современное культурное пространство в идеологии белорусского государства / О. Г. Слука [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://elib.institutemvd.by/bitstream/MVD_NAM/229/3/23477091722560302114780092109850517442.pdf. – Дата доступа: 31.12.2021.